Пралетарыі ўсіх краў, злучайцеся!

Кошт нумару—15 руб. (вып. 22 г.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Падпісная плата—
Звычайная—350 р. льготная—250 р.
Плата за абвесткі—200 руб. за радок петиту.
Сьпешныя—па 50% даражэй.
Плата за публікацыю аб страце дакумантаў:
За 1 дакумант—500 руб.
„ копіны дадатковы—200 руб.
„ копію квітацыі—100 руб.
Чырвон. і утрымьцам Сл. Забясьпекі—даромна.
Падпіска і абвесткі прымаюцца ў Контрагенцтве пры Дзяржаўным Выдавецтве.
(Менск, Петрапаўлаўская, 8).

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
МЕНСК, Замкавая, 97.

ВЫДАНЬНЕ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ.

ТРЭЦІ ГОД ВЫДАНЬНЯ. Штодзенная газэта. № 238 (643). Пятніца, 27-га кастрычніка 1922 г.

Адкрыта падпіска
НА ГАЗЭТУ
„Савецкая Беларусь"
на лістапад месяц.
Падпісная плата:
звычайная 350 руб.
льготная 250 руб.
Падпіска прымаецца ў Менску—у Контрагенцтве Ц. В. К. Б. (*Петрапаўлаўская, 8*), у павятовых аддзяленьнях Контрагенцтва і ва ўсіх пачтова-тэлеграфных канторах Беларусі.

Адчыненьне Бел. Дзярж. Тэатру.
Сёньня, 27-га кастрычніка, роўна а 9-ай гадзіне ўвечары пастаноўкай музыкальнай драмы
„Жрэц Тарквіні"
адбудзецца ўрачыстае адчыненьне зімовага сезону Беларускага Дзяржаўнага Тэатру.

Пад суд!

На толькі Сав. Нар. Гаспадаркі і Нар. Кам. Земляробства павінны клапаціцца аб узмацненьні эканамічнага становішча Савецкай Беларусі.

Кожная Савецкая ўстанова, кожны сьвядомы рабочы і селянін павінен знаць, павінен памятаць, што толькі ў адраджэньні сельскае гаспадаркі з аднаго боку і прамысловасьці— з другога боку ляжыць шлях да лепшай будучыні краю, да моцы Савецкай улады, да моцы сувязі паміж рабочай клясай Беларусі і селяніствам.

З вялікім трудом дастаецца нам кожная капейка, якую мы павінны разлічваць на пашырэньне нашае культуры, на пашырэньне нашае тэхнікі.

На тое жыта, што дае нам селянін, на тыя рэчы, што вырабляе наш беларускі пралетары, на тыя нітакі медныя, што выбіраем мы праз пластві, на тую сыраэну, якую мы не можам абрабіць на адсутнасьці ў нас фабрык і заводаў —на ўсё гэта мы павінны на міжнародным рынку і рынку Ўсерасейскім атрымаць у абмен у першую чаргу тое, што патрэбна для адраджэньня нашай занапашанай і адсталай гаспадаркі...

Але, як на яво, выходзіць зусім іншае. Наша белгосторгі, якім рабоча-селянская дзяржава даручыла гэту адказную справу абмену-гандлю, або не разумеюць, або не хочуць разумець тэй простай ісьціны, што яны слугі краю і павінны рабіць тое, што патрэбна для эканамічнае становішча Савецкай Беларусі.

Яны забываюць, што яны служаць Савецкай Беларусі, і пачынаюць даіць гэтую маленькую, зьнішчаную войнамі і бандытамі Савецкую Беларусь, як нейкую дойную карову.

Той фельетон, які зьявіўся ўчора ў газэце «Звезда» аб нашых «чырвоных» купцох, надта характэрны і, на жаль, праўдзівы. Ён сьведчыць аб тым, што ў Сав. Нар. Гаспадаркі і ў нашым Белторгу ня ўсё ладна. Ён сьведчыць аб тым, што ў гэтым нашым рабоча-селянскім ўстановы залезьлі людзі або недамысныя, або здрадзікі і скурнікі, якія прадаюць інтарэсы працоўнага беларускага люду. Бо інакш як нельга назваць тых, хто на Ніжагародзкай прыварыны за нашы тавары, за пот беларускага рабочага купляе і прывозіць нам тое, што нам зусім непатрэбна — крыжыкі, галёшы ад 1 да 5 нумару і ад 12 нумару і вышэй, гіпны яблыкі, буды і іншую рэчь. Гэта альбо зрада, альбо злачынства, якога ня можна дараваць.

Першая спяма беларускага «чырвонага» купецтва стала фактам, аб якім гаворыць на ўсіх перапрэтках. Яна абурыла нашых рабочых.

Яна выклікала радасьць у спекулянтаў і панаўцаў. Трэба зрабіць, каб радасьць спекулянтаў і панаўцаў была першая і апошняя.

Няхай строгі пралетарскі суд нашага пакарае тых, хто павінен у значнастях супроць нашае гаспадарцы.

Хай адабе ахвоту так ставіцца надалей.

Нота РСФСР і Д-У.Р. Японскаму ўраду.

Народны Камісарыят Чужаземных Спраў РСФСР за подпісам тав. Чычэрына і міністра Чужаземных Спраў Д.-У.Р. Янсана паслаў міністру Чужаземных Спраў Японіі ноту, у якой пратэстуе супроць адцягваньня эвакуацыі японцамі Ўладывастоку і супроць тых перашкодаў, якія там адбываюцца дзякуючы гэтаму адцягваньню.

У гэтай ноце мяшчыцца:

«Японскі ўрад, згодна сваёй ноце зд 19-га ліпеня, у якой ён афіцыяльна паведамляў аб тым, што не пазьней 1-га лістапада с. г. будзе закончана эвакуацыя японскіх войск з расейскіх тэрытоўрый, пачаў эвакуацыю, і зараз японскае войска на сушы займае толькі Ўладывасток і прылягаючы да яго невялікі раён.

Войскі народна-рэвалюцыйнай арміі займаюць зараз усё Прыморра, за выключэньнем адзначанага раёну, і рыхтуюцца ўвайсьці ва Ўладывасток.

Жадаючы занаць Ўладывастоцкі раён морным шляхам, камандуючы народна-рэвалюцыйнай арміяй на ст. «Океанскай», увайшоў у перамаўленьні з японскім камандаваньнем аб мірнай здачы гораду расейскаму камандаваньню. Але камандаваньне японскага экспэдыцыйнага корпусу, к вялікаму жалю, не найшло ня гэта прапанаваньне, патрабавала адыходу войска народна-рэвалюцыйнай арміі і рашуча адмовілася заснаваць якую колечы згоду аб арганізаванай перадачы гораду.

Урады Далёка-Усходняй Рэспублікі і Расеі павінны самым рашучым парадкам пратэставаць супроць гэтага.

Па апошніх вестках з Ўладывастоку, белыя банды, пры падтрыманьні і нават удзеле японскіх афіцэраў і салдат, грамяць і рабуюць склады і краны, вывозячы нарабаваную маемасьць у чужаземныя парты ці ў Манчжурыю, каб там арганізоўваць новыя атрады для барацьбы з Д.-У. Рэспублікай. Расейскі васны і гандлёвы флёт захоплен белымі бандамі і часткай таксама ўведзен у чужаземныя парты. Рабочая насельнасьць і ўсе пратэстуючыя супроць гвалтаў арыштоўваюцца і растрэльваюцца.

Урады Расеі і Д.-У. Рэспублікі ўскладаюць адповедна́сьць за усе гвалты і страты цалком на імпэратарскі японскі ўрад. І разам з тым заўважаюць, што, апрача Японіі, ад паведнасьць за гвалты і рабаваньні на Ўладывастоку ў некаторай частцы кладзецца і на саюзныя з Японіяй урады, якія своечасовым пратэстам не перасьцерагілі ад адзначанай чынпасьці японскага камендаваньня і не дамагаліся ад японскага ўраду мірнай перадачы Ўладывастоцкага раёну камандаваньню Далёка-Усходняй Рэспублікі».

На Далекім Усходзе.

Згода з японцамі.

ЧЫТА, 24-10. Намі. прадстаўнікамі народна рэвалюцыйнай арміі і японскім камандаваньнем заключана згода, на якой японская армія ачышчае Ўладывасток не пазьней 16 гадзін 25-га кастрычніка. К гэтаму часу народна рэвалюцыйная армія займе Ўладывасток.

Што чуваць заграніцай.

Адстаўка Вірта.

ВАРШАВА, 24—10. Па паведамленьню з Бэрліну, на урадавых колах запэўніваюць, што Вірт у бліжэйшыя дні падасьць у адстаўку.

За ўзброеньне пралетарыяту.

БЭРЛІН, 23—10. Па паведамленьню з Вены, на пасяджэньні самага дэмакратычнага партэйтага былы вайсковы міністр-дэпутат Дэйч зрабіў прапанаваньне ўзброіць пралетарыят.

Новы ангельскі габінэт.

ЛЕНДАН, 24—10. Бонар Лёў прадставіў на зацьвярджаньне караля гэткі склад новага габінэту ў Англіі старшыня савету міністраў —Бонар-Лёў, міністр замежных спраў—лёрд Кэрзан, міністр унутраных спраў—сэр Балдуін, вайсковы міністр—Вільсон, міністр калёніяў —Дэрбі, міністр гандлю і прамысловасьці—Стэлл Матланд, марскі міністр—Амэры, міністр асьветы—Стобэ, міністр па справах Шатляндыі—Жупгэр, міністр па справах Ірлядыі—Пэль.

Выбары ў парлямант

ЛІФІЛЬД, 24—10. Выбары новага ангельскага парляманту адбудуцца 14 лістапада. Новы парлямант зьбярэцца 20 лістапада. У новым парляманце замест 707 дэпутатаў будзе толькі 616.

Бымаганьне Турэччыны.

ЛЕНДАН, 23—10. Турэчі, карыстаючыся падзеньнем Лёйд Джорджа, будуць вымагаць поўнага зьдзяйсьненьня трэбаваньняў Нацыянальнага Сходу і запрашэньня на канфэрэнцыю Расеі.

Расея і канфэрэнцыя.

ЛЕНДАН, 24—10. У зьвязку з апошняй нотай Чычэрына, газэта „Манчэстэр Гардыян" настаіваае на запрашэньні Расеі і ўдзелу яе на ўсіх без выключэньня работах канфэрэнцыі.

Тав. Ленін—амэрыканскім рабочым.

У цэнтральных газэтах за 24 кастрычніка г. г. зьмешчаны лісты тав. Леніна да амэрыканскіх рабочых, у якіх ён дзякуе ім за зробленую дапамогу расейскім рабочым. Друкуем іх цалком.

I.

„Таварыству сяброў савецкай Расеі."

(*У Амэрыцы*).

Дарагія таварышы!

Я толькі што праверыў спэцыяльным апросам Пэрмскага губэрскага выканаўчага камітэту тыя надзвычайна прыемныя весткі, якія былі апублікованы ў нашых газэтах датычна працы членаў вашага таварыства за чале з Гарольд Веер, з трактарным атрадам Пэрмскай губ. на савецкай гаспадарцы «Тойкіна».

Ня гледзячы на вялізарныя цяжары, асабліва з прычыны надзвычайна далёкай адлегласьці ад цэнтру паміжнёнага месца працы, а таксама з прычыны разбураньня Колчакам у часе грамадзянскай вайны гаспадаркі, вы дабіліся посьпехаў, якія належыць прызнаць вусім выключнымі.

Сьмяшаюся выказаць вам сваю глыбокую падзяку з просьбай апублікаваць у газэце вашага таварыства, а таксама, калі магчыма, і ў агульнай прэсе Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў.

Я ўваходжу з хадайніцтвам у Прэзыдыум Усерасейскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту аб прызнаньні найбольш выдатных гаспадарак прыкладнымі і аб учыненьні ім спэцыяльнай і экстраординарнай дапамогі, патрэбнай для пашырэньня іх працы.

Яшчэ раз выказваю вам ад імя нашай Рэспублікі глыбокую падзяку і прашу мець на ўвазе, што ніводная дапамога не зьнуліцца для нас такой своечасовай і такой важнай, як зробленая вамі.

Старшыня Савету Народных Камісараў ЛЕНІН.

II.

Таварыства тэхнічнай дапамогі Савецкай Расеі.

Дарагія таварышы!

У нашых газэтах зьявіліся надзвычайна прыемныя весткі паконт працы членаў вашага таварыства ў савецкіх гаспадарках Кірсанаўскага павету, Тамбоўскай губэрні, і пры станцыі Мініна, Адэскай губэрні, а таксама аб працы групы шахцёраў у Данецкім басэйне.

Ня гледзячы на вялізарныя перашкоды і асабліва з прычыны разбураньня ў часе грамадзянскай вайны, вы дасягнулі посьпехаў, якія можна прызнаць надзвычайнымі.

Выказваю вам сваю шчырую падзяку і прашу аб гэтым надрукаваць у органе вашага Таварыства, а таксама, калі можна, і ў агульнай прэсе Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў.

Я ўваходжу з хадайніцтвам у Прэзыдыум Усерасейскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту аб прызнаньні гэтай савецкай гаспадаркі прыкладнай і аб тым, каб зрабіць ёй спэцыяльную і экстраординарную дапамогу як у адносінах будаўнічай справы, так і забясьпечаньні безапам, матэрыялам і інш. матэрыялам, неабходнымі для арганізацыі рамонтнай майстэрні.

Яшчэ раз выказваю вам ад імя нашай Рэспублікі глыбокую падзяку і прашу мець на ўвазе, што ніводная дапамога не зьнуліцца для нас такой своечасовай і такой важнай.

Старшыня Савету Народных Камісараў ЛЕНІН.

Напярэдадні 4-га Кангрэсу Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

VII.

Камуністычны рух у Скандынавіі.

Скандынаўскія краіны складаюць Швэцыя, Нарвэгія і Данія з васельнасьцю каля 12 міліёнаў чалавек. Найбольшая з гэтых краін—Швэцыя экая налічвае каля 6 міліёнаў чалавек, Данія—$3^1/_2$ міліёны і Нарвэгія—$2^1/_2$ міліёны. Лік наёмных рабочых складае ў Швэцыі каля 700 000 чалавек, у Даніі каля 400.000 і прыблізна столькі ж у Нарвэгіі.

Усе тры Скандынаўскія дзяржавы маюць старыя і моцныя рабочыя арганізацыі—палітычныя прафесыянальныя і кааперацыйныя, якія знаходзяцца між сабой у цеснай сувязі. Так, напрыклад, член прафесыянальнага саюзу зьяўляецца тым самым членам палітычнай партыі.

Данія.

Датычна адносін сіл сацыял-згодніка ў і камуністаў, горш за ўсё стаіць справа ў Даніі. Тут сацыял-згодніка маюць моцную арганізацыю: у радох дацкай с.-д. партыі, якая стаіць на правым флянгу 2 інтэрнацыяналу, налічваецца каля 250.000 членаў; партыя мае 60 штодзённых газэт. Камуністы маюць усяго некалькі тысячаў арганізаваных членаў і прытым у радох камуністаў да гэтай пары няма поўнай арганізаванай адзінасьці. Гэта і зьяўляецца галоўнай прычынай слабасьці камуністычнага руху. Апрача таго, Данія зьяўляецца краінай моцных фэрмэраў, якія маюць высока-культурныя малочныя, насенныя і іншыя гаспадаркі. І пагэтаму ў Даніі значна лягчэй пашырыць сваю ўплывасьць сацыял-згоднікам.

Швэцыя.

У Швэцыі абставіны для разьвіцьця камунізму значна лепшыя. Швэцыя мае моцную мэталічную, лясную і паперовую прамысловасьць. Камуністычная партыя Швэцыі налічвае 20.000 членаў, ды столькі ж налічвае Швэцкі К.С.М. Сацыял-згоднікі маюць каля 90.000 членаў у сваёй партыі. Швэцкая камуністычная партыя мае 12 газэт, з іх 2 штодзённыя. У швэцкім парляманце зараз камуністаў 7 на чале з тав. Гэтлунзам і Штрэмам, 6 левых с.-д. і 93 правых с.-д. з вядомым сацыял-згоднікам Брантынгам, які зьяўляецца ў цяперашні час старшынёй каалісыйнага швэцкага ўраду.

Нарвэгія.

У Нарвэгіі камуністычная партыя зьяўляецца пануючай—яна мае каля 150.000 членаў, у той час, як с.-д. у сваёй арганізацыі налічваюць усяго некалькі тысячаў чалавек. У нарвэжскім парляманце 29 камуністаў і 8 правых с.-д. Лібэральны ўрад Нарвэгіі вымушан лічыцца з камуністычнымі членамі парляманту, бо ён мае за сабой назначную большасьць. Заснаваньне добра-суседзкіх адносін з Савецкай Расеяй, цапамога галадуючым Расеі з боку нарвэжскага ўраду—усё гэта тлумачыцца дамаганьнем моцнай камуністычнай партыі ў краю і ў парляманце.

Камуністычная партыя Нарвэгіі мае 35 газэт, з іх 14 штодзённых, 20 друкарняў, вялікае партыйнае выдавецтва, тэлеграфнае агэнцтва. Прафесыянальныя саюзы знаходзяцца пад адзіным уплывам камуністычнай партыі. Яны па скандынаўскаму звычаю зьяўляюцца калектыўнымі членамі камуністычнай партыі. Прафесыянальнае аб'яднаньне пакуль яшчэ ўваходзе ў Амстэрдамскі прафесыянальны інтэрнацыянал, але бадай усе асобныя саюзы ўжо зрабілі пастановы аб далучэньні да Чырвонага Прафесыянальнага Інтэрнацыяналу. Канчатковы разрыў з Амстэрдамам—справа бліжэйшай будучыны.

Усе тры Скандынаўскія краіны ня прымалі ўдзелу ва ўсясьветнай вайне, а пагэтаму значна пашырылі сваю прамысловасьць. У гэтых дзяржава, за часы вайны сабралася шмат золата. Гэты грашовы капітал умацаваў пасьляваенны крызіс. Кошты на рэчы вырабу сталі дужа высокімі. Скандынаўская прамысловасьць ня можа канкурыраваць з таннымі нямецкімі тавярамі. У выніках на ўсёй Скандынавіі беспрацоўе, забастоўкі прадпрыёмцаў з мэтай зьмяншэньня заробку і павялічэньня працоўнага дня, імкненьне скандынаўскай прамысловасьці на расейскі рынак.

Усе гэтыя эканамічныя ўмовы павядуць, бязумоўна, к пашырэньню камуністычнага руху, к росту Камуністычна Інтэрнацыяналу ва ўсіх Скандынаўскіх краінах, не выключаючы і Даніі.

Д.

VIII.

Аўстрыйская камуністычная партыя.

Нідзе ў сьвеце працоўныя не адчуваюць так балюча вынікі імпэрыялістычнай вайны, як у Аўстрыі. Зьнішчаная рабаўніцкай палітыкай саюзьнікаў Аўстрыя жыве з падачак Антанты. Грашовая сыстэма Аўстрыі, не буйнейшая вытворчасьць—у руках чужаземцаў. Усім кіруе біржа. У яе руках—урад каталіцкай „сацыяльна - хрысьціянскай" партыі, якая апіраецца на вясковае куластва і на чале якой стаіць поп прахат Зайпэль. Яго стараньні—канчаткова распрадаць Аўстрыю—ядомы.

Вена ня толькі вуладны пункт усясьветнай спэкуляцыі, але і цэнтр памірайючага эрзац 2½ Інтэрнацыяналу. Яго правадыры—Адлер, Бауэр, Рэнэр і іншыя, якія яшчэ нядаўна крытыкавалі 2-гі Інтэрнацыянал у пытаньнях міжнароднай рабочай палітыкі, унутры свайго краю ўжо 3 гады праводзяць палітыку глыбока буржуазную. Сацыяль-дэмакратыя, якая мае вялікі ўплыў у Аўстрыі, з году ў год пешыць рабочых антантаўскімі крэдытамі, затрымлівае, а часамі і зусім душыць стыхійныя рэвалюцыйныя выступленьні (напр., непарадкі ў Вене 1-га сьнежня 1921 г.). Перад наступам капіталу яны не знаходзяць нічога лепшага як патрабаваць ад рабочых ахвяр дзеля паратунку краю ад «катастрофы» і займацца выключна пытаньнямі карыснага вядзеньня гаспадаркі буржуйнай рэспублікі. Інакшымі словамі—не кіраўніцтва рабочай клясай у яе барацьбе за свае жыцьцё, не паляпшаньне яе становішча за кошт ажыраўшай буржуазіі, а барацьба парляманцкая, карыстаньне пралетарыяту з мэтай „аздараўленьня народнай гаспадаркі"—усё гэта дзеля „паратунку дэмакратыі і рэспублікі". Гэта палітыка праводзіцца праз добра наладжаны бюрократычны апарат сацыял-дэмакратычнай партыі, якая стараецца ўтрымаць у сваіх руках рабочыя гушчы, якія ўсё часьцей робяць свае эканамічныя і палітычныя выступленьні бяз ведама і наперакор волі меншавіцкіх правадыроў.

Умерканьне гэтага ідучага зьніву рэвалюцыйнага руху шляхам зьяднаньня актыўных рабочых у **камуністычную партыю**—вось бліжэйшы шлях аўстрыйскага пралетарыяту. На гледзячы на ўсю спрактыкаваную дэмагогію меншавіцкіх правадыроў, на агульнае абясьсіленьне рабочых, аўстрыйская камуністычная партыя разьвіваецца вельмі шпарка.

Сарваны сацыял-дэмакратамі адзіны фронт фактычна ўжо заснаваны між камуністычнай партыяй і ўсім сьвядомым пралетарыятам. Стыхійныя агульныя забастоўкі чыгуначнікаў, металістаў, бачтавікоў, друкароў, падтрымачыя адной толькі камуністычнай партыяй,—лепшы прыклад адзінага фронту. Грунтоўныя патрабаваньні камуністаў—барацьба за даваенны заробак, зачыненьне біржы, дапамога беспрацоўным, падаходнае аблажэньне буржуазіі, перадача кантролю над вытворчасьцю ў рукі фабрычна-заводзкіх камітэтаў—пасьпешна праклядаюць сабе дарогу праз гушчу нядбайнасьці і старых традыцыяў. Адным з рэальных посьпехаў зьяўляецца частычная зьмена камуністамі рэйхсэрэ (дзяржаўнага апалчэньня; у ім каля 40 проц. салдат—члены К. П., рэшта—сацыял-дэмакраты). У Аўстрыі насьпяваюць здарэньні найвялікшай значнасьці. Пагроза акупацыі Аўстрыі саюзным войскам надбліжаецца. Ідэёвае кіраўніцтва здарэньнямі ня можа абчыцьціся без камуністычнай партыі.

Ад яе арганізацыйнага росту і ад рашучасьці рабочых гушчаў залежыць лёс аўстрыйскіх рабочых. У іншым выпадку, ім ня ўхіліцца ад канчатковага абяднеьня і прыгнечаньня.

У.

Становішча пазэмкоў у Заходняй Беларусі.

Пытаньне аб долі дворскіх парабкоў зьяўляецца ў Заходняй Беларусі вельмі дражлівым пытаньнем. Становішча іх рэзка розьніцца з аднаго боку ад становішча рабочых у саўхозах Савецкай Федэрацыі, з другога боку—ад становішча батракоў у Заходняй Эўропе.

На Захадзе Эўропы ды й нават у каранной Польшчы батрацкая справа сяк-так наладжываецца. Батракі там становяць вельмі лічную групу сельскіх работнікаў, маюць свае прафэсыянальныя арганізацыі, дабіліся ўстанаўленьня агульнае ўмовы ад варункаў найму і, дзейнічаючы дружнай грамадой, дабіваюцца далейшых паляпшэньняў свае долі. А якую яны маюць сілу, паказвае сёлетняя іх забастоўка, якая ў часе жніва пагражала польскім панам абшарнікам пялізарнымі стратамі.

У Заходняй-жа Беларусі батракі, можна сказаць, зусім неарганізаваны. Праўда, была ў Вільні спроба стварыць батрацкую арганізацыю, але гэтая арганізацыя яшчэ вельмі слабая і мала што вдзелала зрабіць. У дадатак да гэтага яна сустрэла моцны націск з боку адміністрацыі. А ў тым часам доля батракоў становіцца ўсё больш цяжкай: паны, бачачы іх бяспомочнасьць, вычнараюць з іх самыя дзікія рэчы.

Напрыклад, у Навагрудзкім павеце паны завялі такую моду. Уместку, калі трэба было шмат рабочых рук, яны пагабіралі шмат батракоў умаўляючыся на год. Аднак, як толькі работы ў полі скончыліся, гэтых батракоў пачала выкідаць вон, пакрыз насупроць зімы. Ведама, гэта гвалт і беззаконьне могуць мець месца толькі там, дзе батракі неарганізаваны і дзе ўлада знаходзіцца ў руках паноў. Да гэтага яшчэ трэба дадаць, што у Навагрудзкім павеце гаспадарыць такі чалавек, як пан Рачкевіч, які добра даўся ў знакі беларусам у Менску пад час польскай акупацыі.

Калі пачалася перадвыборная барацьба, то розныя партыі сталі падладжвацца да батракоў, рабіць ім абяцанкі аб недзяленьні зямлі. Але гэтыя абяцанкі робяцца ўпустыра і без надзеі іх ажыцьцяўленьня. Пакуль у Польшчы будуць пераходзіць паны, датуль ня будзе палёгкі батрацкай долі. Толькі зруйнаваньне панскай Польшчы і ўстанаўленьне Польскай Савецкай Рэспублікі дасьць батракам магчымасьць распачаць новае жыцьцё.

М. С.

Рэвалюцыйны рух у Польшчы.

I.

Камуністычная Рабочая Партыя Польшчы

Рэпрэсіі на галавы рэвалюцыйных польскіх рабочых сыплюцца ўвесь час, як з рога ізабілія.

Арышты, зьдзекі, гвалты ня спыняюцца.

Але, ня гледзячы на ўсё гэта, рэвалюцыйны рух у Польшчы ня спыняецца. Наадварот, з кожным днём ён пашыраецца ўсё больш і больш, захопліваючы масы працоўнага люду. Лепшы рэвалюцыйнага руху ў Польшчы моцна трымае у сваіх руках Камуністычная Рабочая Партыя Польшчы, якая ў сучасны момант, дзякуючы тактыцы адзінага рабочага фронту, пусьціла глыбокія карэньні ў гушчы рабочай масы.

Першае пытаньне, якое нас павінна цікавіць, як суседзяў Польшчы, *гэта пытаньне аб тым, калі і пры якіх умовах выбухне пралетарская рэвалюцыя ў Польшчы.* Адказ на гэтае пытаньне дала трэцяя партыйная канфэрэнцыя К.Р.П.П. Апроч гэтага, усё, што датычыць рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, павінна зьвярнуць на сябе ўвагу беларусаў. Нам трэба помніць, што рэвалюцыя ў Польшчы нясе збаўленьне ня толькі польскай рабочай клясе і польскаму малазямельнаму сялянству, але і закупаванымі часткам Украіны і Заходняй Беларусі. З гэтае прычыны мы і паставілі для сябе заданьнем паказаць беларускіх рабочых і сялян з рэвалюцыйным рухам у Польшчы.

У першую чаргу мы зьвяртаем увагу нашых чытачоў на правадыра і гэгэмона гэтага руху—Камуністычную Раб. Партыю Польшчы, якая ўвесь час знаходзіцца ў падпольлі.

3-ая Партыйная Канфэрэнцыя К.Р.П.П.

У красавіку 1922 г. адбылася чарговая партыйная канфэрэнцыя Камуністычнай Рабочай Партыі Польшчы. Гэта ўжо *трэцяя* па ліку канфэрэнцыя з часу заснаваньня Партыі ў 1918 г.

Склад канфэрэнцыі быў вось які: з *рашаючым* голасам—41 таварыш, у тым ліку члены Ц. К. і дэлегаты арганізацыяў, а іменна: з г. Варшавы—3, Дэмброўскага раёну—3, г. Лодзі—3, Усходняй Галіччыны—3, Варшаўскай Акружнай—2, Лодзінскай Акружнай—2, Чанстахову—2, Келецка-Радамскага Вокругу—2, Беластоцкага Вокругу—2, Улацлаўскага—2, Познані—2, Верхняй Сілезіі—2, Цешынскай Сілезіі—2, Плоцку—1.

З дарадчым голасам—15 таварышоў, а іменна: часовыя намесьнікі членаў Ц. К., прадстаўнікі Цэнтральнай Рэдакцыі, аддзелаў: прафсаюзнага, чыгуначнага, жыдоўскага, па працы на вёсцы, тэхнічнага, Саюзу Камуністычнай Моладзі, а таксама некалькі гасьцей, у тым ліку прадстаўнік Камуністычнага Бунду.

Такім чынам, на канфэрэнцыі прысутнымі было ўсяго 56 таварышоў.

Парадак дня, прапанаваны Ц. К. і прыняты канфэрэнцыяй, складаўся з вось з якіх галоўных пытаньняў. 1) міжнароднае палітычнае становішча і становішча ў Польшчы ў зьвязку з пытаньнем аб тактыцы адзінага фронту; 2) справаздача Ц. К. з боку палітычнага і арганізацыйнага; 3) зямельнае пытаньне; 4) пытаньне аб прафэсыянальных саюзах; 5) нацыянальнае пытаньне; 6) выбары Ц. К. (членаў і кандыдатаў).

Дэманстратыўныя рэвалюцыі.

У пачатку працы канфэрэнцыя ўшанавала праз уставаньне памяць членаў партыі, якія загінулі ахвярамі за справу рэвалюцыі, і прыняла аднагалосна дэманстратыўныя рэзалюцыі з прычыны забойства тав. Яна Кржоса ў Стракавіцах, прывітаньне палітычным арыштованым рабочым і сялянам і, нарэшце, рэзалюцыю прывітаньня Савецкім рэспублікам. З прычыны цікавасьці гэтае рэзалюцыі мы перадрукоўваем яе цалком:

«Трэцяя Канфэрэнцыя К. Р. П. П. ад імя рэвалюцыйнай рабочай клясы Польшчы шле вітаньне і выказвае таварыскасьць перадавому пасту міжнароднай пралетарскай Рэвалюцыі Федэратыўным Савецкім Рэспублікам, якія адважна змагаюцца болей чатырох год супроць усіх сіл капіталістычнага сьвету.

Разумеючы самую неразрыўную сувязь міжнароднай рабочай справы з лёсам Расейскай Рэвалюцыі, польскі пралетарыят, які ідзе пад сьцягам К. Р. П. П., лічыць сябе моцна зьвязаным братэрскай злучнасьцю з пралетарскай Расеяй і гатоў у любы патрэбны момант напрагчы ўсе сілы дзеля яе падтрыманьня і абароны».

Адзіны рабочы фронт.

На гэта пытаньне Канфэрэнцыя зьвярнула найбольш увагі, і, нарэшце, была прынята рэзалюцыя ў духу рашэньняў павялічанага пленуму Выканаучага Камітэту Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

Калі і пры якіх умовах магчыма рэвалюцыя.

Найбольш цікавае і галоўнае пытаньне,—пытаньне аб тым, пры якіх умовах выбухне рэвалюцыя ў Польшчы, нашло выразны адказ у рэзалюцыі аб становішчы ў Польшчы.

Гэта рэзалюцыя мае гістарычную значнасьць і дзеля гэтага мы зьмяшчаем яе цалком.

Рэвалюцыйны крызіс у Польшчы 3 гады таму назад.

«Ад іншых краёў Польшча розьніцца тым, што ў канцы 1918 і 1919 году не перажывала рэзкага дэмабілізацыйнага крызісу. Яна ня мела вайсковай прамысловасьці, а значыць і ня мела небясьпекі, зьвязанай з дэмабілізацыяй прамысловасьці з мэтай забесьпячэньня працаўнай жаўнерскіх мас, якія вярталіся з вайны. Яна ня мела таксама і ўласнай арміі, а значыць ня мела і вялікага крызісу, зьвязанага з дэмабілізацыяй жаўнераў.

Рэвалюцыйны крызіс у Польшчы тры гады таму назад меў дзьве крыніцы. З аднаго боку на ўсходзе істнавала ўлада Саветаў; а на захадзе—у Нямеччыне фактычная ўлада ў канцы 1918 году і ў пачатку 1919 г. папала ў рукі рабочых і салдацкіх Саветаў, а клясавая барацьба пачала там выяўляць усё болей грозны характар. У цісках паміж пабеднай рабочай рэвалюцыяй—паміж Нямеччынай і Расеяй, капіталістычная Польшча ўтрымацца не магла б і павінна была-б пад націскам мас хутка апынуцца месца Польскай Савецкай Рэспублікі. З другога боку,—Польшча ня мела тады ўласнай арміі, паліцыі, дзяржаўнай адміністрацыі і ўсяго буржуазнага дзяржаўнага апарату, неабходнага для абароны капіталістычнай уласнасьці.

У Савецкай Фэдэрацыі.

Праэкт кодэксу грамадзянскіх законаў.

МАСКВА, 26 10. На засяданьні 25-га кастрычніка сесія Усерасейскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту разглядала праэкт кодэксу грамадзянскіх законаў. Кодэкс дае расейскаму пралетарыяту гарантыі, што ўсе галоўныя галіны прамысловасьці пры новай эканамічнай палітыцы застануцца ў руках дзяржавы. Дапушчаючы розныя аб'яднаньні, кодэкс пакідае за дзяржавай права спыняць дзейнасьць гэтых аб'яднаньняў, калі чыннасьць іх будзе шкодная. Усе буйныя галіны прамысловасьці: чыгункі і шэраг іншай гаспадаркі зьяўляюцца выключнай уласнасьцю дзяржавы. Прыватная ўласнасьць дапушчаецца ў абмежаваных рамках, заснованых савецкімі законамі. Адзінічным асобам даецца права на маемасьць у межах, не парушаючых інтарэсаў дзяржавы. Гэтыя асобы павінны выпаўняць наложныя абавязкі, усталяваныя дзяржавай. Пасьля спрэчак праэкт кодэксу прыняты за аснову і перададзены на апрацаваньне камісіі.

Прывітаньне.

АРХАНГЕЛЬСК, 25-10. Сход матросаў галяндзкага і ангельскага параходаў, якія знаходзяцца ў Архангельскім парту, паслаў прывітальную тэлеграму Камуністычнаму Інтэрнацыяналу і Леніну.

За хабарніцтва.

КРАСНАЯРСК, 21—10. Аддадзена пад суд за хабарніцтва 65 чыгуначнікаў Томскай чыгункі. Сярод іх ёсьць адпаведныя служачыя.

Дзейнасьць Адэскага парта.

ХАРКАЎ, 23-10. Дзейнасьць парта пашыраецца. У бліжэйшыя дні чакаецца прыбыцьце значнага ліку чужаземных караблёў.

Зварот караблёў Фінляндыяй.

ПЕЦЯРБУРГ, 23-10. Прыбылі апошнія караблі, зьвернутыя нам Фінляндыяй.

К IV Сэсіі Усерасейскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту.

Гэта сэсія Усерасейскага Цэнтральнага Выканаўчага Кам'тэту—асобная дзелавая. Новая эканамічная палітыка, якая ўсё больш разгортваецца і паглыбляецца, патрабуе выразных цьвёрдых фармуліровак у тых законах і ў тых кодэксах, дзе да гэтай пары імкненьні сацыялістычнай дзяржавы вызначаліся ў выглядзе дэкларацыяў.

Як пытаньні працы, гэтак і зямельныя пытаньні прыцягваюць зараз асаблівую ўвагу рабочага і сялянскага кэпю. Свабода гандлю, харчовы падатак, арэнда і ўсё тое, чым вызначаецца новая эканамічная палітыка, імкнуцца значна зьмяніць нашы ранейшыя кодэксы аб працы і аб зямлі. Заданьне рабочага парляманту—УЦВК—перагледзець і зацьвердзіць гэтыя кодэксы такім чынам, каб інтарэсы рабочай клясы і рабоча сялянскай дзяржавы былі ахованы і каб пытаньне аб зямлі вырашана было так, каб была дадзена свабода разьвіцьцю вытворчай сілы.

Перад краінай стаіць вельмі важнае, цяжка вырашальнае пытаньне аб нашых грашовых справах. На гэта пытаньне УЦВК зьверне асаблівую ўвагу.

Пытаньні савецкага будаўніцтва за пяць год істнаваньня Савецкай улады ні адзін раз абгаварываліся на Усерасейскіх зьездах і на сэсіях УЦВК І зараз на гэтай сэсіі яно ня будзе абыйдзена.

Гэта дзеловая ва ўсіх адносінах сэсія з шырокім парадкам дня зьяўляецца ўступам к X зьезду саветаў, які скажа сваё аўтарытэтнае слова наконт багатай практыкі, сабранай нашай крынай за ўсе пяць год яе савецкага жыцьця нагул і за год новай эканамічнай палітыкі.

Зьнішчэньне беларускіх архіваў па Вітабшчыне.

На Вітабшчыне дужа дрэнна стаіць справа аховы архіваў, якія, праўда, ня маюць асаблівых старадаўнасьцяў (самыя старадаўныя дакументы вывезены ў Вільню ў пачатку XX в.), але ўсё-ж маюць вельмі каштоўныя дакументы для дасьледаваньня размаітых бакоў беларускага як вясковага, так і мясцовага жыцьця.

Хваля зьнішчэньня архіўных дакументаў разьлілася па ўсёй Вітабскай Беларусі, і можна чакаць, што хутка на Вітабшчыне стануць зьнішчацца і старыя капітальныя архівы, якія захаваліся яшчэ да гэтага часу: гэта—Вітабскі Цэнтральны Архіў і архіў былой Полацкай Духоўнай Кансысторыі.

А здарылася гэта дзякуючы таму, што вялікая праца аховы архіваў на Вітабшчыне была даручана зусім невядомаму прышэльцу—«прафэсару» Брэжга—чалавеку вельмі загадачнай нацыянальнасьці і стольки-ж загадачнай чыннасьці, які, нічога не робячы для аховы архіваў, нават дапамагаў іх зьнішчэньню. У зьвязку з гэтым ён ужо блізка месяцу адпачывае ад «вялікае працы» у паколях Вітабскага Г. П. У., якое ў сучасны момант надта заплянавулена ў вучобай, службай і грамадзянскай дзейнасьці «прафэсара» Брэжга, які, трэба дадаць, як загадчык Вітабскага Археолёгічнага Інстытуту, многа пастараўся, каб не дапусьціць перадачы Менску маемнасьці памянёнага Інстытуту.

Я ня буду пералічваць усіх архіваў, якія загінулі. Скажу толькі, што апрача двух старых вышэйпамянёных вялікіх архіваў, добра захаваўшыхся, астатнія, усе да аднаго—або загінулі, або гінуць, знаходзячыся ў пачатковай ці ў канчатковай стадыі зьнішчэньня несьвядомымі людзьмі і да ўсяго няўважнымі стыхіямі...

Я спынюся на адным вельмі характарным і вельмі значным па вялікасьці прыкладзе.

У памятовым месьце Вітабшчыны Вяліжы Ак. Шлюбскім быў арганізаваны без капейкі грошай і з вялікімі замінаньнямі архіў, у які былі зьвезены ўсе да аднаго архівы двух паветаў: Вяліжскага і Суражскага, якія ўпалелі ад рэвалюцыі, усяго лікам больш, як 50.

Для гісторыі Беларусі гэты архіў мае надзвычайна вялікую вартасьць, бо зьяўляецца адзіным ня толькі ў Беларусі, але блізка ва ўсёй РСФСР архівам, у якім захаваны запалеўшыя архівы былых валасных праўленьняў, вельмі важныя для дасьледаваньня размаітых форм юрыдычнага быту вясковых беларусоў. Вартасьць гэта найболш павялічваецца дзякуючы поўнаму зьнішчэньню ўсіх іншых валасных архіваў ня толькі ў Вітабшчыне, а й на ўсёй тэрыторыі этнаграфічнай Беларусі.

Дык вось гэта паштоўнае сабраньне дакументаў, як толькі арганізатар яго паехаў з Вяліжу (дзеля арганізацыі архіваў у Полацку і Воршу), было кінута на волю лёсу. У стары самотны будынак, пабудаваны Сыпцінам Баторыем, які стаіць на мейсцы старадаўняга замку, сталі пранікаць злодзеі, рабіць бязладзьдзе, рваць і псаваць дакументы, а, галоўным чынам, цягнуць іх дзеля праданьня ў драбязныя крамы.

Губэрскае архіўнае начальства разам з Вяліжскім Угалоўным Розыскам бязьдзейнічаюць, а гаспадар дому, за тое, што яму ня плоцяць з самага пачатку за дом, ладзіцца выкінуць на вуліцу гістарычныя дакументы, сабраныя з цяжарам, старанасьцю і паханьнем...

Алеся Гаротная.

Да агульнага ведама.

Паведамляецца, што рэдакцыя „Савецкай Беларусі“ перамясьцілася ў дом № 97 па Захараўскай вуліцы (другі паверх).

ЗАВОД.

У бегу дзён я чую звон,
Магутны звон стальны...
За ім яшчэ званы
У даль бягуць, зьвіняць, гудуць.
Заводзяць роем пчол
Ідуць, па вочапах паўзуць
Раменьні навакол.
Між іх палос ёсьць шмат калёс—
Ад іх ізноў шнуры,
А тут насос у землю ўрос...
Мурашкі—жыхары
Скрозь дым і муць куюць, куюць
Зялеза і чыгун;
А печы дзьмуць, агнём плююць...
А стружку нібы ўюн
Варстат грызе,—яна паўзе
З зубоў яго на дол,—
Аж пот ідзе!... Завод гудзе
Ўдалі ад ніў і сёл.

16/х 22 г. *А ГУРЛО*

Што абараніла буржуазную Польшчу.

Крывавая перамога контр-рэвалюцыйных банд Носкэ ў Нямеччыне (забойства 15.000 рэвалюцыйных рабочых і правадыроў рэвалюцыі Розы Люксэмбург і Карла Лібкнэхта і інш.), ушчэньне Савецкай Расеі ў цяжкую ўнутраную барацьбу з узброенымі і падтрыманымі Антантай контр рэвалюцыйнымі атрадамі чэха-славакаў, палякоў, Калчака, Дэнікіна і г. д. адбаранілі буржуазную Польшчу ад небясьпекі перанесьці польскі рэвалюцыі знадворку.

Нацыяналістычны чад, абхапіўшы шырокія масы дробнай буржуазеі і частку рабочых з прычын неспадзяванага і нечаканага абвяшчэньня незалежнасьці Польшчы, выратаваў буржуазею ад рэвалюцыйнага крызісу ўнутры. У той час, калі іншыя краі перажывалі небясьпечны крызіс дэмобілізацыі арміі, Польшча толькі пачала тварыць уласную армію, якая ўцягівала ў сябе ўсё большую частку безработных.

Буржуазная Польшча—лёкай Францыі.

Буржуазная Польшча, паўстаўшая ў выніку пабеды бальшавіцкай рэвалюцыі ў Расеі і вайсковага развалу цэнтральных дзяржаваў, зрабілася патрэбным рэпей усяго для мілітарызму Францыі, як арудзьдзе, якое павінна замяніць царскую або буржуазную Расею ў палітыцы абароны Версальскага «міру» і разьзяленьня Нямеччыны. У той меры, як расла надзея на хуткую ліквідацыю пралетарскай рэвалюцыі ў Расеі праз узброеную інтэрвэнцыю, імкненьне польскага нацыяналізму да пашырэньня дзяржаўных межаў знаходзіла ўсё большае падтрыманьне капіталістычна-рэакцыйнай Францыі.

Фікцыя вялікадзяржаўнасьці.

Вялікадзяржаўныя імкненьні польскага нацыяналізму акупіяліся пры дапамозе ахвяр, якія павінны выклікаць і выклікаюць усё большае нездавальненьне мас да нацыяналізму і нахіл да павялічаньня і абвастрэньня клясавай барацьбы.

Польшча дастае самую багатую частку Верхняй Сілезіі, Вільню, Усходнюю Галіччыну ў замену за перадачу галіцыйскай нафты, верхнясілескай руды і чыгуналіцейных заводаў і г. д. у руці францускага і ангельскага капіталу, а таксама ў замену за гандлёвую, палітычную і ваенную згоду з Францыяй, якая навідывае на польскі народ нячуваны падатак.

Перадаючы за фікцыю вялікадзяржаўнасьці крыніцы сыр'я і найлепшыя галіны прамысловасьці ў рукі магутных заграничных трастаў і прызнаючы ў замену за гэту фікцыю гандлёвую, палітычную і ваенную згоду, Польшча фактычна адмаўляецца ад суверэнытэту ў гаспадарчых і палітычных пытаньнях.

У міжнароднай палітыцы, а ў значнай меры нават на ўнутраных адносінах гэта азначае паўную залежнасьць Польшчы ад загаду францускага капіталу і мілітарызму. Францускі пасланьнік у Варшаве, Панафʼе, пачтарае ролю пасланьнікаў Кацярыны ў Польшчы канца 18 веку, умешываецца ў справы габінэту міністраў і нават у развагі соймавага камэнту старшыняў у момант урадавых крызісаў і г. д.

Не пасілах размахнуліся.

Гэтая вялікадзяржаўнасьць і імпэрыялізм, які ні ў якім разе не адпавядае ні сіле польскага капіталу, ні становішчу гандлю і прамысловасьці, ні фінансаваму становішчу дзяржавы, але апіраецца выключна на сілу штыкоў і на ня пэўны грунт Версальскага «міру», кіруе да патрэбы палітычнай рэакцыі, да ўціску працоўных мас, да павялічэньня падатковага цяжару.

У сучасны момант пасьля заканчэньня вайны, пасьля дэмабілізацыі—з усіх капіталістычных краёў Польшча утрымлівае параўнаўча самую большую армію і вырасходуе на ве ў параўнаньні з іншымі самыя найвялікшыя сродкі. Яна прымушана гэта рабіць дзеля абароны свайго вялікадзяржаўнага становішча. На будову новых казэрмаў вырасходуецца болей, чымся на будову школ або жылых дамоў, на прывоз з-заграніцы амуніцыі—болей, чымся на прывоз вырабаў для адбудовы гаспадаркі. Польшча выпаўняе двухгадовую вайсковую службу, хаця нават крайня-мілітарыстычная Францыя зьменшыла гэту службу да $1^1/_2$ г.

Гаспадарчае становішча Польшчы.

Палітыка войнаў і мілітарызму ў працягу трох год перашкаджала гаспадарчай адбудове Польшчы. Яна выклікала вось якое цікавае зьявішча: у той час, калі іншыя краі з нізкай валютай могуць запаўняць прадуктамі сваёй прамысловасьці краі з высокай валютай, польская прамысловасьць і гандаль ня могуць вытрымаць канкурэнцыі краёў з высокай валютай і павінны адгараджацца ад іх таможнай сьцяной. Адгатуль выходзіць пастаянны, бадай нясцыняючыйся крызіс у прамысловасьці і гандлю, які толькі час-ад-часу ажыўляецца на кароткі час. Але нават у момант найвышэйшага ажыўленьня прамысловасьць і гандаль ня могуць даць работу даваеннаму ліку рабочых. Пасьля ажыўленьня зноў надыходзіць масавае безрабоцьце.

Безрабоцьце і дарагоўля.

Аварыя цяжасьці безрабоцьця працоўны люд нясе на сябе пасьледкі палітычнай вайны ў форме павіжэньня вартасьці грошай, якое выяўляецца ў няўпынным узросьце дарагоўлі, што ўсім цяжарам сваім адбіваецца на баднейшых народных слаёх, на працоўнай інтэлігэнцыі, на дробнай буржуазеі, на дзяржаўных, камунальных і прыватных служачых. Гэта выклікае пастаяннае сапраціўленьне рабочых, вядзе да новых забастовак і нават выклікае бунт дзяржаўных служачых (чыноўнікаў) тых рабоў буржуазеі, якія маюць заданьнем узмацнаваць апарат дзяржаўнага ўціску і якіх дзяржава ня можа ні пракарміць, ні апрануць.

Падаткі.

Але імпэрыялістычная палітыка і далейшыя спробы гаспадарчай адбудовы Польшчы на капіталістычным грунце павінна вымагаць усё новых і ўсё большых падаткаў, ад якіх церпіць галоўным чынам працоўны люд. Новыя падаткі выклікуць новую хвалю дарагоўлі, намінуча пачнецца яшчэ болей вострая клясавая барацьба з мэтай перакінуць цяжары капіталістычнай адбудовы і палітыкі вялікадзяржаўнага грабежства на плечы працоўных клясаў. Наступ кіруючых клясаў, якія навязываюць масам пабочныя падаткі, злучаецца такім чынам з наступам прыватнага капіталу, стварэньнем для рабочых горшыя ўмовы жыцьця.

Банкроцтва зямельнай рэформы.

У справе зямельных адносінаў палітыка ўраду і сойму ў працягу трох гадоў давяла да поўнага банкроцтва буржуазнай зямельнай рэформы. Гэта рэформа, якая абяцала зямлю раней усяго безьзямельным і малазямельным сялянам, цяпер стала для ўсіх відочным абманам. Сялянства, бедната *павінна будзе зразумець, што дастаць зямлю праз выкуп, спакойным чынам, пры дапамозе дзяржаўнай адміністрацыі і зямельных органаў*

Па Менску.

Адпуск леса бяднейшаму жыхарству.

Дзеля здаволеньня бяднейшага жыхарства і пацярпеўшых ад стыхійных няшчасьцяў Народны Камісарыят Земляробства выдзаліў у кожным ласьніцтве 10% лесасечнага фонду 1922—1923 г., які павінен быў пайсьці на мясцовыя патрэбы. Па загаду Народнага Камісарыяту Сацыяльнай Апекі лес будзе адпускацца ў першую чаргу сем'ям чырвонаармейцаў, пайшоўшым у Чырвоную армію пры астатнім прызыве, у другую—пацярпеўшых ад астатніх пажараў і ў апошнюю чаргу—дэмабілізаваным чырвонаармейцам, інвалідам (калекам) і бяднейшаму сялянству жыхарству.

Атрыманьне падаткаў.

На 15-га кастрычніка скарбніцай Народнага Камісарыяту Грашовых Спраў атрымана па ўсёй Беларусі дзяржаўных прамых і касьвеных падаткаў і збораў 362.326.280 рублёў.

Пабудоўка станцыённых памяшканьняў.

З 15-га кастрычніка пачата праца па пабудаваньню станцыённых памяшканьняў на пограничнай станцыі Болсавы. Працу маецца на ўвазе скончыць да 1-га сьнежня.

Дзяржаўнае штрахаваньне.

Беларуская кантора дзяржаўнага штрахаваньня кончае ў бліжэйшы час працу па абавязковаму штрахаваньню будынкаў у гарадох. Да 1-га кастрычніка зарэгістравана ў гарадох Беларусі 13.175 будынкаў, якія заштрахованы на 327.782.627 рублёў. Налічана страховачных збораў 2.089.848 руб. У лік гэтых збораў атрымана 1.676.287 руб. Беларускай канторай выплачана пагарэльцам штрахоўкі 22.605 руб. З посьпехам пашырэньня добраахвотнае штрахаваньне.

Універсальны магазын Чырвонага Крыжу.

У бліжэйшы час Беларускі Чырвоны Крыж адчыняе магазын, прыбыткі якога пойдуць на ўтрыманьне яго ўстановаў.

Барацьба з вырабам самагонкі.

У працягу апошніх двух месяцаў у Галоўную Управу Сыску пададзены 62 справы аб патайным вінакурэньні і прадажы сьпіртных напіткаў. Выкрыта 42 выпадкі патайнага вінакурэньня.

Дом для лячэбных установаў.

Народным Камісарыятам Аховы Здароўя зроблен дагавор з Камунальнай Гаспадаркай на перадачу яму дома № 29 на Саборным Плошчы. У гэтым доме Народны Камісарыят Аховы Здароўя мае на меце згуртаваць усе ўстановы, якія знаходзяцца пад яго ведамам.

К барацьбе са сьнежнымі заносамі.

На Менскім вучастку Александраўскай чыгункі вядзецца ўзмоцненая праца па падгатоўцы барацьбы са сьнежнымі заносамі. Вучастак забясьпечан усімі патрэбнымі прыладамі.

Менскае Таварыства Гісторыі і Старасьвеччыны.

У суботу 28-га кастрычніка а 8 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Ўніверсытэту (рог Скобелеўскай і Магазынная вул., былая гімназія Фальковіча) адбудзецца пасяджэньне (16-е чарговае) Менскага Таварыства Гісторыі і Старасьвеччыны.

Прадмет пасяджэньня:

1. Даклад праф. Нічэты: «Чарговыя пытаньні беларусазнаўства».
2. Паведамленьне выкладацела Маслакаўца: «Ізраілаўская кафля 17-га веку».
3. Бягучыя справы.

Уваход вольны.

Праўленьне.

Сьвята беларускага тэатру.

Сёньня, 27 кастрычніка, беларускі тэатр справіць сваё ўрачыстае сьвята, і Белар. Дзярж. Тэатр у гэты дзень адчыніць госьцяпрыязна свае дзьверы, каб уступіць тым самым у другі год свайго істнаваньня і, як у гэтым упэўніцца лёгка кожны беларус, прышоўшы на „Жраца Тарквінія", сваіх выдатных пасьпехаў. <Ой, горкім быў хлеб мінулага сэзону работнікам Беларускага Дзярж. Тэатру і шмат здароўя страчана артыстычнымі сіламі пры працы ў холадзе і голадзе, але ўсё гэта, папершым, засталося ззаду і так балюча, што й ня варта ўспамінаць, а, падругім, і гэта самае галоўнае —дасягнутыя пасьпехі Белар. дзярж. трупы так вялікі і, пачэрпа кажучы, так нечаканы—бо яшчэ такі малы тэрмін Б. Дз. Тэатр стаіць рацуе,— што хочацца рапавацца, а не ўспамінаць благое.>

Гэнэральныя рэпэтыцыі „Жраца Тарквінія" паказалі, што вялікая праца т. Міровіча Я. над белар. трупаю дала багаты плён. Трагэдыя маладога расейскага драматурга С. Поліванава памастацку перакладзена М. Кудзельнам. Шаноўны кіраўнік тэатру так багата ве надумаў і зьдзейсьнае, што, гледзячы нават рэпэтыцыю, забываеш умовы сцэны, сачыш за зьнестам, дэкарацыі і вопраткі цешаць вока, сьпевы і музыка абагачае ўражаньне, і ўсё гэта так зладжана суглясна, так зьліваецца ў „праўду жыцьця", што душу агартае радасьць за дасягнутыя пасьпехі і высока-мастацкае здавальства ігрою і зьнестам п'есы.

Наш Дзярж. Тэатр уступае ў другі багаты вынікамі год сваёй працы. Жычым яму заслужанае зараз поўнае залі публікі, собе-ж—пэўнасьці, што будзем выносіць заўсёды такое ўражаньне, як з „Жраца Тарквінія", якое ўзвышае душу.

А. Г-ль.

Абвестка.

Сёньня 27-га кастрычніка а 8½ гадзіне ўвечары ў памяшканьні Ацетамічнага тэатру (Магазынная, 27) склікаецца гадавы агульна-студэнцкі сход медыцынскага факультэту.

Навестка дню:

I. Даклад рэктара.
II. Справаздача акадэмічнай секцыі.
III. Справаздача казначэйскай секцыі. Садаклад Праўленьня Касы Узаемаданамогі.
IV. Перавыбары студэнцкіх арганізацыяў.
V. Бягучыя справы.

Яўка ўсіх студэнтаў усіх трох курсаў патрэбна абавязкова.

Бюльлетэнь № 87

Менскай Мэтэаролёгічнай Станцыі
Галоўнай Фізычнай Обсэрваторыі
пры Менскай Дасьледчай Балотнай Станцыі

За 25 і 26 кастрычніка 1922 году.

СТРУМЭНТ.	1 гадзіна дню.	9 гадз. вечара.	7 гадз. раніцы
Барометр	744,3 m/m	743,3 m/m	741,1 m/m
Тэрмометр	—0,6°	—1,2°	0,6°
Максымальны тэрмометр	—0,5°	1,0°	0,6°
Мінімальны тэрмометр	—3,0°	—1,0°	—1,2°
Вільгаць параўнаўчая	71%	86%	86%
Асадкі у міліметрах	—	—	—
Грунтавы тэрмометр на глыбіні 0,8 м.	4,7°	4,6°	4,0°
» » » » 0,4 метра	2,7°	2,6°	2,4°

— ПРЫМАЕЦЦА —
ПАДПІСКА
—) на усе (—
ГАЗЭТЫ
МЯСЦОВЫЯ і ЦЭНТРАЛЬНЫЯ
— на —
ЛІСТАПАД месяц
Контратэнцтва
Цэнтр. Вык. Кам. Беларусі
Петрапаўлаўская, 8.

Падпісная плата
на ЛІСТАПАД
на мясцовыя газэты:

Сав. Бел.—350 р.	льготн.	250
Звязда—400 р.	»	300
Дэр Вэгэр—350 р.	»	250
Młot—250 руб.	»	150

на цэнтральныя газэты:

Известия ВЦИК	450 р.
Правда	450
Труд	—
Экономич. жизнь	250
Беднота	230
Дэр Эмэс	150
Гудок	—
Прод. газета	—
Рабочая Москва	165
Рабочая газета с журн. «Крокодил»	200

Згубленыя:

— Пашпарт, выд. Харкаўскай Гарадзк. Міліц., Карэін Ф.А., кв. 5134.

— 1) Пашпарт, выд. Менск. Гарадзк. Міліц., Кудзіновіч С. Ю., 2) нотрычн. выпіска, выд. Менск. Заксэм на імя Кудзіновіч Т. І., кв. 5259.

— Пасьведч. на надворнаму выгляду, выд. Нар. Суд. у Астрашыцк. Гарадку, Каплан Э.Я., кв. 5260.

— Часовае пасьведч. на жыхарст., выд. Кацярынаслаўск. Гарадзк. Міліц. за № 14421, Гольштэйна А. І., кв. 5261.

— Часовае пасьведч., выд. Менск. Ваєнспортцэнтр., Кахаўскага І.А., кв. 5262.

— Пашпарт, выд. Менск. Мянч. Упр., Вайдлер Р. І. О.-А., кв. 5264.

— Лічн. карт., выд. Менск. Пав. Ваєн. Кам., Фрыдлянда Ш. М., кв. 5265.

— Лічн. карт., выд. Менск. Пав. Ваєн. Кам., Сапожнікава М. М., кв 5266.

— Членск. кніжка, выд. саюз рабоч. камунальн. гаспадаркі за № 887, Пелей Хаі, кв 5267.

— Лічн. карт., выд. Слуцкім Павят. Ваєн. Кам. за № 129/1188, Царыка Цімафея, кв. 5268.

— 1) Лічн. карт., выд. Слуцк. Павят. Ваєн. Кам.; 2) пасьведч. аб хваробе, выд. Асобай Камісіяй пры Слуцк. Павят. Ваєн. Кам., Хільневіча А. А., кв. 5269.

— Лічная карт., выд. Слуцк. Павят. Ваєн. Кам. за № 786. Кваша М. Р., кв. 5270.

— Лічн. карт., выд. Слуцк. Павят. Ваєн. Кам. за № 15, Касьцюкевіча І. В., кв. 5271.

— Лічн. карт., выд. Цераўскім Вал. Ваєн. Аддзел. у 1920 г., Лешко Андрэя, кв. 5272.

— Пашпарт, выд. Петрапаўлаўскім Вал. Уповаж. Таўрычаскай губ., Барбовай Д. Я., кв. 5273.

— Пасьведч. па надворн. выгляду, выд. камісіяй пры Менск. Павят. Ваєн. Кам. Вальчаке С. В., кв. 5274.

— Пашпарт, выд. Менск. Гарадзк. Міліц., Славінскай Л. М., кв. 5275.

— Лічн. карт., выд. Слуцк. Павят. Ваєн. Кам. за № 221/1038, Прожжа І. К., кв. 5276.

— Лічн. карт. з адчнакай аб зьнятьні з уліку, выд. Слуцк. Павят. Ваєн. Кам., Шэйпука А. О., кв. 5277.

— Лічная карт., выд. Сьмідавічск. Вал. Ваєн. Аддзел за № 54, Шчурко Д. А., кв. 5278.

— Пашпарт, выд. Менск. Мянч. Упр., Белгарадзкай Х.Ш., кв. 5279.

— Лічная карт., выд. Менск. Павят. Ваєн. Кам., Трацьцяк Ф. А., кв. 5280.

— Лічная карт., выд. Менск. Пав. Ваєн. Кам., Трацьцяк В. Ф., кв. 5281.

— 1) Лічная карт., выд. Цюменск. Павят. Ваєн. Кам.; 2) пасьведч. аб звальненьні са службы, выд. Цюменскай Службай Руху Омскай чыгункі, Ермалюка Ф. К., кв. 5282.

— Пашпарт, выд. Менск. Мянч. Упр., Голуб Ю.Ф., кв. 5283.

— Пасьведч. асобы, выд. 8 вуч. Пуці Александр. чыг. за № 4198, Чэбана А. А., кв. 5284.

— Лічная карт., выд. Астрашыцка-Гарадзецк. Вал. Ваєн. Аддзел. за № 1501, Міхалевіча Н. А., кв. 5285.

— Лічная карт., выд. Сёмкава-Гарадзецк. Вал. Ваєн. Аддз. за № 93, Скварчэўскага В. Ф., кв. 5286.

— Лічная карт., выд. Столькаўск. Вал. Ваєн. Аддзел. за № 10, Сьлінкова Е. В., кв. 5287.

— Пашпарт, выд. Менск. Гарадзк. Паліц. Упр. за № 234/279, Родзевіча А. Ф. і пашпарт, выд. Менск. Дваранск. Дапутацк. Сабр. за № 238, Родзевіч М. А., кв. 5288.

— Лічная карт., выд. Смалевіцк. Вал. Ваєн. Аддзел. за № 76, Мірончыка Ф. П., кв. 5289.

— Лічная карт., выд. Смалевіцк. Вал. Ваєн. Аддз. за № 19, Яськевіча В. Ф., кв. 5290.

— Членск. кніжка, выд. саюз. прац. спурск. выробу за № 325, Іменскага Міхеля, кв. 5291.

— Звальніцельны білет, выд. Менск. Павят. Ваєн. Кам. за № 1085, Кажухоўскага П. С., кв. 5292.

— Часов. пасьведч. на жыхарств., выд. Менск. Гарадзк. Міліц., Сітэрмана А. С., кв. 5293.

Ня можа ня ўдасьца і шмат мальскі канфіскацыя, г. з. рэвалюцыя можа вырваць зямлю з рук панаў.

Уціск рабочых.

У адносінах да рабочага руху мінулыя тры гады вызначаюцца павялічаньнем уціску і рэпрэсіяў, якія з часу наступу Пілсудзкага на Савецкую Ўкраіну прымялі выгляд яўнага тэрору, галоўны зьнак, у адносінах да рэвалюцыйных рабочых арганізацыяў і да сельска-гаспадарчых рабочых. Крыніцамі ўціску з'яўляюцца дзеля спыненьня рабочага руху з пазыцыяй дзікасьцю і нацрыстойнасьцю, якіх ня бывала нават да вайны пад чужаземнай уладай.

Уціск нацыянальных меншасьцяў

У адносінах да польскіх народнасьцяў, якія жывуць на Польскай зямлі і, *галоўным чынам, у адносінах да насьленьня ўсходніх і заходніх паволяў, наступка польскага імпэрыялізму выяўляецца у нацыянальным і эканамічным уціску.* На Савецкай старане Беларусі і Ўкраіны забраная ў панаў зямля перайшла ў рукі сялян. У акупованых-жа Польшчай вобласьцях беларускія і ўкраінскія сяляне выцясьняюцца з іх зямлі, робячыся ахвярамі калонізацыйнай палітыкі польскай буржуазеі. Па тую старану граніцы поўная свабода нацыянальных культур: у школах, судох, у адміністрацыі, армі—усюды родная мова. *На гэту сторону ўціск самых жаўнных нацыянальных культурных організацый беларускіх і украінскіх, недазвол навучаньня родной мовы у школе, зачыненьне царкоў, або перароблен іх у каталіцкія.*

Рэакцыйны характар польскага імпэрыялізму зробна яркі выяўляецца варвацтве у адносінах да жыдоўскага насельніцтва, выклікаючы ў жыдоўскай масе такую ненавісьць да польскай улады, якой у іх ва было нават у адносінах да царызму.

Тры галоўныя прычыны рэвалюцыі.

З вышэй сказанага відаць, што рэвалюцыя ў Польшчы будзе мець выходным пунктам вось якія тры галоўныя зьявішчы:

1. Рэвалюцыянізаваньне рабочых мас дзеля таго, што павялічаецца наступ капіталу з ўраду, якія імкнуцца перанесьці на працоўныя масы ўсе выдаткі дзяржаўнай палітыкі і капіталістычнай адбудовы.

2. Рэвалюцыянізаваньне шырокіх мас безьзямельных і малазямельных сялян, як пасьледкі бакрацтва зямельнай рэформы і абастрэньня клясавых супрацьлежнасьцяў на вёсцы у барацьбе за зямлю.

3. Нарастаючае узмоцненьне рэвалюцыйнага руху на усходніх паволяцах з прычын клясавай палітыкі польскага ўраду, а таксама дзеля нацыянальнага уціску.

Так апісывала становішча ў Польшчы Камуністычная Рабочая Партыя Польшчы у красавіку 1922 г.. Трэба сказаць, што яно не змянілася. Наступ буржуазеі на рабочых з таго часу ня толькі, ня зьменшыўся, а павялічыўся яшчэ болей у зьвязку з выбарамі ў сойм. Арышты рабочых і сялян ідуць ня толькі ў цэнтрах рэвалюцыйнага руху, але па ўсёй Польшчы, па ўсіх паволях і глухіх кутках.

Але аб гэтым у другі раз.

Н-скі.

1-я Савецкая друкарня — Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі Менск — Р. Ц. (№ 983)